**225710**

г. Пінск, ІПД, 35

☏ **32-23-66; 35-50-65**

E-mail:CRBPinsk@tut.by

Складальнік,
камп'ютарны набор і афармленне В.П. Рэбкавец

Рэдактар Г.Ф.Богнат

# Пінская РЦБС

## Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

*Літаратурная спадчына Піншчыны*



# Сцежкамі беларускае даўніны

(да 55-годдзя з дня нараджэння Аляксея Нянадаўца, пісьменніка, фальклрыста, літаратуразнаўца, краязнаўца, педагога)

**Пінск, 2013**





46.**Саўчанка, М.** Пісьменнік нарадзіўся ў Чухаве [аб А.Ненадаўце ] / М.Саўчанка // Полесская правда. 1996. 29 мая

47.**Тондзель, М.** Сцежкамі беларускае даўніны: [пра кн. А.Ненадаўца “Святло таямнічага вогнішча”] / М.Тондзель // Полымя. 1995. №9. С.273-280

48. **Самуйлік, М.** Дзве кнігі нашага земляка: [А.Ненадавец “Пакланіся дубу” і “Крэпасць на Беразіне”]/ Міхаіл Самуйлік // Пінскі веснік. 1993. 25 жніўня

49. **Алексей Ненадовец** написал книгу о Бобруйске // http://babruisk.by/rus/новости/культура/2716

50. **Алексей Ненадовец** написал книгу о Бобруйске // http://regiony.by/news/

51. **Растаев, Д.** Хапун, опивень, лозовик [мифические существа у А.Ненадовца ] / Дмитрий Растаев // http:// www/belgazeta.by/ru/2012_10

52. **Красавин, А.** Кастанеда или Ненадовец? / Александр Красавин // http://www.proza.ru/2009/12/25/237

53. **Ненадовец Алексей Михайлович** //http://who-is-who.by/details.php?id

54. **Ненадавец, А.М.** // http://pinsk.gov.by/town/calendar.php

33. **Ненадавец, А.М.** Праклятыя словам/ А.М.Ненадавец. Бабруйск, 2006. 192 с.
34. **Ненадавец, А.М.**Выявы міфалагічнага выраю / А.М.Ненадавец. Мінск: Беларус. навука, 2010. 263 с.
35. **Ненадавец, А.М.** Святыя криницы Пинщины, толкование их свойств служителями церкви. Народный взгляд / А.М.Ненадавец // Программа XIII Международной научной конференции “Славянская традиционная культура и современный мир”.Москва, 21-23 мая 2008 года //http://ru-folklorist.livejournal.com/100932.html
36. **Ненадавец, А.М.** Якуб Колас і Палескі край/ А.М.Ненадавец // Пінскі веснік. 2007. 14 жніўня
37. **Ненадавец** Аляксей Міхайлавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / Мінск,1998. Т. 11.С. 285.
38. **Ненадавец** Аляксей Міхайлавіч // Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. Мінск, 2006. Т.2 С.248-249
39. **Ненадавец А.М.** // Современная Беларусь: энциклопедический справочник в 3-х т. Т.3. Культура и искусство. Минск: Беларусская наука, 2007. С.140
40. **Пінскі** раён. Аляксей Ненадавец // Літаратурная карта Берасцэйшчыны / укл. А.Крэйдзіч. Брэст, 2008. С. 493 – 494
41. **Ненадавец** Аляксей Міхайлавіч// Учёные Пинщины:[справ. издание] / авт.-сост. И.А.Кибак, П.Н.Синкевич, В.В.Василеввицкий. Пинск: Пин. регион. тип., 2012. С.95-96; 211-212
42. **Ненадавец** Аляксей Міхайлавіч// Ученые Пинщины:[справ. издание] / авт.-сост. И.А.Кибак, П.Н.Синкевич. Минск, 2003. С.86
43. **Рабава І.** Аляксей Ненадавец: у чым сэнс “народнай каляды”? / Ірына Рабава // Вечерний Бобруйск. 2012. 5 января
44. **Как белорусы проклинают друг друга:** [интервью с профессором А.Ненадовцом] // Комсомольская правда. 2007. 22 ноября
45. **Менделева, И.** Нервных просим не читать [о книге А.Ненадавца “Праклятыя словам”] / Ирина Менделева // Советская Белоруссия. 2007. 10 февраля




Аляксей Міхайлавіч Ненадавец нарадзіўся 12 лютага 1958 года ў вёсцы Чухава Пінскага раёна ў сям’і калгаснікаў.

Бацька, Міхаіл Аляксеевіч, працаваў трактарыстам, у час уборкі— камбайнёрам, быў лепшым механізатарам калгаса “Прагрэс”. Маці, Марыя Уладзіміраўна, была першай звенявой калгаса, мала шмат працоўных узнагарод.

Акрамя Аляксея, у сям'і выхоўваліся адна сястра і два браты. З дзяцінства Аляксей, як і другія члены сям'і, быў заняты працай: дапамагаў бацькам у хатняй гаспадарцы, у больш сталым узросце працаваў памочнікам камбайнёра разам з бацькам.

У 1965 годзе стаў вучням Чухаўскай сярэдняй школы. З успамінаў яго першай настаўніцы Лінкевіч Алены Лукінічны трэба адзначыць: "Па характары ён быў вельмі спакойным, справядлівым у адносінах да іншых, з адказнасцю выконваў даручэнні, не пакідаў у бядзе сваіх сяброў, паважліва адносіўся да дарослых. На ўроках быў вельмі ўважлівым, вучыўся добра, на 4-5. Любіў урокі фізкультуры і матэматыкі." Увесь свой вольны час праводзіў за кнігамі, любіў гуляць у футбол. З дзяцінства праявіліся ў яго любоў да роднай мовы, да родных мясцін, да сваіх блізкіх, пачаў спрабаваць пісаць вершы. Атрымалася.

## ***Адлёт жураваў***

Ці ты бачыў, мой дружа, як ляцяць журавы,
У ланцужок расцягнуўшы доўгі.
Так журботна на сэрцы стане тады:
Да вясны журавы пакідаюць край родны.
Іх наперадзе шлях нялёгкі чакае,
Будуць буры, дажджы і снягі,
У верасні раннім журавы адлятаюць,
Краю роднага песняры.

Жураўы адлятаюць, і, здаецца,

Што слабейшаю стала палеская раць,

Калі зноў, з бяроз, веснавы сок пальецца,

Жураўы - песняры прыляцяць.

*24 снежня 1974 года 10 кл.*

Скончыўшы Чухаўскую сярэднюю школу, паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, поўны курс якога па спецыяльнасці "Філолаг-выкладчык" завяршыў у 1980 годзе. Пасля размеркавання А. Ненадавец застаўся асістэнтам на кафедры рускай літаратуры гэтай жа навучальнай установы. У тым жа годзе паступіў у аспірантуру Інстытута літаратуры імя Я.Купалы АН БССР, адкуль прызвалі ў войска. Служыў у Туркестанскай ваеннай акрузе, быў у камандзіроўках у Афганістане. Вясною 1982 года А. Ненадавец дэмабілізаваўся і аднавіўся ў аспірантуры, якую пасляхова закончыў у 1985 г. З 1985 па 1989 гг. - асістэнт, дацэнт кафедры рускай літаратуры ГДУ імя Скарыны. З лютага 1989 года - дактарант Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы АН БССР. З 1992 года Аляксей Міхайлавіч - на пасадзе старэйшага навуковага, а потым вядучага навуковага супрацоўніка гэтай навукова-даследчай установы рэспублікі. З 2000 года - загадчык кафедры дзяржаўных і замежных моў Бабруйскага філіяла Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта.

Кандыдацкую дысертацыю абараніў у 1985 годзе па тэме "Дакастрычніцкая творчасць Я. Коласа і фальклор", доктарскую - у 1995 годзе.

Аўтар больш за 720 навуковых і навукова-папулярных публікацый у айчынным і замежным друку. Сваю фантастычную працаздольнасць сам Аляксей Ненадавец тлумачыць проста: "Вандроўкі па родным краі, фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі для мяне не толькі творчая праца, але і цудоўны адпачынак".




18. **Ненадавец, А.** Тэадор Нарбут / Аляксей Ненадавец. Мінск: Полымя, 1996. 63 с.
19. **Ненадавец, А.** Ліса / Аляксей Ненадавец // Беларуская думка. 1997. №3 С.173-175
20. **Ненадавец, А.** Летапіс горада на Бярэзіне (1387-1917)/ Аляксей Ненадавец. Мінск: Выш. шк., 1998. 149, [2] с.
21. **Міншчына**: Назвы населенных пунктаў паводле легендаў і паданняў / склад., запіс, апрац. А.М.Ненадаўца. Мінск: Беларусь, 1998. 718 с.: іл.
22. **Ненадавец, А.** Міфалагічныя матывы ў паэмах А.Міцкевіча «Дзяды» і «Пан Тадэвуш» / Аляксей Ненадавец // Беларуская думка. 1998. №7 С.180-184
23. **Ненадавец, А.**Свет міфалагічных уяўленняў (прадказанні пеўня і зязюлі) / Аляксей Ненадавец // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1999. №1
24. **Ненадавец, А.** Чорт у легендах і паданнях беларусаў/ Аляксей Ненадавец. Мінск: ТАА "ПаліБіг", 1999. 110 с.
25. **Ненадавец, А.М.** За смугою міфа. Мінск: Беларуская навука,1999. 254 с.
26. **Ненадавец, А.** Урывак з кнігі "Пакланіцеся дубу" / Аляксей Ненадавец // Піншчына літаратурная: літ.-маст. зб. / рэдкал.: М.І.Ляшук (гал. рэд.) і інш.; прадм. В.І.Локун; уступ. арт. І.Д.Чараўко. Рэдакцыя газеты "Пінскі веснік", 1999. С.85
27. **Гродзеншчына**: Назвы населенных пунктаў паводле легендаў і паданняў / склад., запіс, апрац. А.М.Ненадаўца. Мінск: Беларусь, 1999. 398 с.: іл.
28. **Віцебшчына**: Назвы населенных пунктаў паводле легендаў і паданняў / склад., запіс, апрац. А.М.Ненадаўца. Мінск: Беларусь, 2000. 478 с.: іл.
29. **Ненадавец, А.** Адкуль цячэ сіні Дунай? / Аляксей Ненадавец // Беларуская думка. 2000. №10. С.152-156
30. **Магілёўшчына**: Назвы населенных пунктаў паводле легендаў і паданняў / склад., запіс, апрац. А.М.Ненадаўца. Мінск: Беларусь, 2002. 416 с.: іл.
31. **Ненадавец, А.**Жыццядайныя крыніцы: Легенды і паданні / Аляксей Ненадавец. Мінск: Юнацтва, 2002. 158, [1] с.
32. **Ненадавец, А.**Міфалогія / Аляксей Ненадавец // Міфалогія. Духоўныя вершы / А.М.Ненадавец, А.У.Марозаў, Л.М.Салавей, Т.А.Івахненка; навук. рэд. А.С.Фядосік. Мінск: Беларуская навука, 2003.(Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка. Кн.5). С.9-318

# Бібліяграфічны спіс


1.**Ненадавец, А.**Роля фальклору ў станаўленні творчай індывідуальнасці Якуба Коласа / Аляксей Ненадавец // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1984. №5

2.**Ненадавец, А.** Паэма Я.Коласа «Новая зямля» ў кантэксце беларускага фальклору / Аляксей Ненадавец // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1985. №2

3.**Ненадавец, А.**Фальклорная аснова паэмы Якуба Коласа “Сымон-музыка”/ Аляксей Ненадавец // Беларуская літаратура. Мінск, 1985. Вып. 13

4.**Ненадавец, А.**Вобраз вужа ў народнай міфалогіі і літаратуры / Аляксей Ненадавец// Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1989. №5

5. **Ненадавец, А.**Жылі мядзведзі / Аляксей Ненадавец // Родная прырода. 1990. №4

6. **Ненадавец, А.** Агонь ачышчае / Аляксей Ненадавец // Родная прырода. 1992. №3

7. **Ненадавец, А.**Дрэва Сусвету / Аляксей Ненадавец // Роднае слова. 1992. №4

8. **Ненадавец, А.**Шанаванне дубоў / Аляксей Ненадавец // Роднае слова. 1992. №8

9. **Ненадавец, А.**Вяшчун агню і світанку / Аляксей Ненадавец // Роднае слова. 1992. №12

10. **Ненадавец, А.**Славянская міфалагічная мадэль стварэння Сусвету/ Аляксей Ненадавец // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1992. №5-6

11. **Ненадавец, А.**Паэтычны развод; З набалелага: [вершы]/ Аляксей Ненадавец // Дзень паэзіі, 1992. Мінск: Маст. літ., 1993. С.92

12. **Ненадавец, А.** Крэпасць на Бярэзіне/ Аляксей Ненадавец. – Мінск: Полымя, 1993. 71 с.

13. **Ненадавец, А.**Воўк...Ваўкалак...Ваўкарэзіна... / Аляксей Ненадавец // Родная прырода. 1994. №6

14. **Ненадавец, А.** Русалка / Аляксей Ненадавец // Беларуская думка. 1994. №9

15. **Ненадавец, А.** Святло таямнічага вогнішча / Аляксей Ненадавец. Мінск: Беларусь, 1994.

16. **Ненадавец, А.**Дуб Перуна / Аляксей Ненадавец // Роднае слова. 1995. №11

17. **Брэстчына**: Назвы населенных пунктаў паводле легендаў і паданняў / склад., запіс, апрац. А.М.Ненадаўца. Мінск: Беларусь, 1995. 431 с.: іл.




Акрамя таго, А. Ненадавец напісаў наступныя творы: "Крэпасць на Бярэзіне" (1993), "Тэадор Нарбут" (1996), "Летапіс горада на Бярэзіне (1387-1917)" (1998).

Аляксей Ненадавец лічыць, што "стаць доктарам навук у нашай цудоўнай краіне зусім проста: трэба толькі скончыць вясковую школу, пайсці вучыцца ва універсітэт, праз год-паўтары, зразумець, што не адны там суперголавы вучацца і ў такіх умовах можна хутка атупець, калі не пачаць займацца самаадукацыяй. Яшчэ добра, каб цябе такі ж доктар навук заўважыў і на дзейнасць блаславіў. Я ўсё думаў, чаму гэта Мікалай Міхайлавіч Грынчык, прафесар, доктар навук загадчык кафедры беларускай літаратуры менавіта на мяне звярнуў увагу? А калі ўжо стаў прафесіяналам, то і сам навучыўся бачыць людзей. *Як* палякі гавораць: "Відна пана па халявах". Яшчэ, памятаю, калі да нас прыехала ва універсітэт рэспубліканская камісія, Грынчык прывёў іх да сябе на заняткі па беларускай літаратуры. І як старасту групы падняў мяне адказваць. Я хвілін 40 адказваў, да самага званка. А калі камісія пайшла, пасля перапынку заходзіць Грынчык і пытае: "У вас ёсць што яшчэ дадаць?" — "Так". — "Працягвайце". Ужо пасля таго выпадку ён выклікае мяне на кафедру і пытаецца: "Прафесарам быць хочаце?" Я ў адказ: "А не цяжка?" — "Не. 650 рублёў аклад". О, якія гэта былі грошы!

Пры размеркаванні застаўся асістэнтам на кафедры рускай літаратуры гэтай жа навучальнай установы. У 1980 годзе паступіў у аспірантуру інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. З марай пра жаданыя 650 рублёў прыйшлося пачакаць. Аказалася, што будучыя прафесары проста да зарэзу патрэбныя нашай доблеснай арміі. Не змагла яна абысціся і без Аляксея Міхайлавіча. З Гомеля прызвалі на службу ў Савецкую Армію. Служыў у Туркенстанскай ваеннай акрузе, быў у камандзіроўках у Афганістане.

Будучы ў Арміі, Аляксей Міхайлавіч сваёй маці прысвяціў альбом-кнігу пад назвай "Мілай матулі сваёй прысвячаю", які быў зроблены сваімі рукамі. У ім былі размешчаны вершы і малюнкі, прысвечаныя сваёй маці, малой Радзіме.

Вясною 1982 года Аляксей дэмабілізаваўся і аднавіўся ў аспірантуры. Вярнуўшыся, ё'н пачаў паціху набліжаць сваю мару: абраў такую тэму кандыдацкай дысертацыі, якую б паўгода не маглі зацвердзіць. Ну каму патрэбная тая "Дакастрычніцкая творчасць Коласа і фальклор"? Не актуальна, не па-савецкі. Можа, з гэтай "неактуальнай" тэмай і хадзіў бы да перабудовы, калі б Алесь Адамовіч на вучоным савеце не заступіўся: "Хлопец хоча пісаць па Коласу, хай піша". І дазволілі. Аспірантуру ён пасяхова закончыў у 1985 годзе.

З 1985 па 1989 гады - асістэнт, дацэнт кафедры рускай літаратуры Гомельскага універсітэта імя Скарыны. З лютага 1989 года Ненадавец А.М. дактарант Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

Аляксей Міхайлавіч надзвычай працавіты. У 1995 годзе абараніў доктарскую дысертацыю па тэме "Праблемы хтанічнага архетыпа ў беларускім фальклоры". Займаецца даследаваннем міфалогііі фальклору беларусаў, узаемасувяззю літаратуры і фальклору, краязнаўствам.

Да ўсяго сказанага хачу дабавіць, што ёе просты ў абыходзе. Добры муж, бацька. Жонка Лілія Іванаўна - урач. Сын Ягор зараз з'яўляецца студэнтам Магілёўскага універсітэта імя А. Куляшова журналісцкага факультэта. Кожны год у час летняга адпачынку прыязджае Аляксей Міхайлавіч на сваю маленькую Радзіму, сустракаецца з землякамі, любіць бавіць час на лоне прыроды, збіраць грыбы. Шмат дапамагаў маці па гаспадарцы. На жаль, восенню 2005 года яе не стала.

Аляксей Ненадавец не з тых, пра каго кажуць, што яшчэ ў вясковым хлопчыку ў караценькіх штанішках відзён быў будучы фальклырыст.

Цікавасць да міфалогіі з'явілася толькі тады, калі пачаў працаваць над кандыдацкай. Гэта чалавек па натуры авантурыст, той - хто шукае прыгод.



## *Мой дзед савецкім быў салдатам*

Мой дзед савецкім быў салдатам
Тады, калі ішла Айчынная вайна,
Вайну закончыў ён у 45-ым,
Каля цвітучага нямецкага сяла.
Глядзеў на вішні, яблыні і грушы,
Глядзеў і сам сябе ўспамінаў.
Такія ж тут сады, як і ў нас, у Беларусі.
Такі ж і сад яго, які ён сам саджаў.
Глядзеў і неба: чымсьці так падобны
І сонца, й навальніцы, і вятры.
Да тых вятроў ,што дзьмуць ў краі родным,
Да той палескай роднае вярбы.
Дзед і цяпер, як сядзе дзе з сябрамі,
І пра былое ну ўспамінаць,
Як цяжка з роднымі было развітацца барамі,
І цяжка як было звароту ў родны край чакаць.

# *Беларусь*

Беларусь! Ты Радзіма мая,
Радзіма палёў, лясоў і рэк.
Беларусь  - гэта спеў салаў'я,
Дзе так вольна жыве чалавек.

Беларусь—гэта ў полі вярба.
Беларусь—гэта маці мая,
Беларусь—гэта крыж журава,
Беларусь, у мяне ты адна.

Беларусь—гэта маці мужных сыноў.
Шэлест лясоў і гоман пшаніцы.
Беларусь, за цябе я пайсці гатоў,
Каб ты, Беларусь, век цвіла маладзіцай.

Без цябе немагчыма мне жыць,
Немагчыма заснуць без цябе.
Беларусь, ты адна, каго вечна я буду любіць,
Прысягаю табе  я гэтыя словы сваеє!





А што гэта праца карысная А. Ненадавец кажа, што, толькі калі на яго творы пачалі спасылацца навукоўцы з іншых краін, прысылаюць рэцэнзіі на кнігі, паверыў, што ўсё робіць правільна. І ён спадзяецца, што збіранне легендаў стане "сямейнай справай". Аляксей Ненадавец - вясковы чалавек. Яго мара: "Калі дажыву да гадоў 60-ці, то з'еду ў вёску. Хочацца жыць у цішыні, быць каля людзей."

Вось такія ў нас доктары навук. Для шчасця ім патрэбна адно толькі сустракацца з разумнымі і творчымі людзьмі ды мець маленькую мару, як тое стварыць беларускую міфалогію кшталту міфалогіі старажытных грэкаў, якую ведаюць ўсе народы свету.




Беларускай міфалогіяй, а затым і дэманалогіяй А. Ненадавец пачаў займацца з пачуцця зацікаўленасці. Было цікава даведацца, каму пакланяліся нашы продкі і дзе карані іх вераванняў. Як зараз лічаць вучоныя, усе нашы фальклорныя нячысцікі родам з раннеязычніцкага перыяду. Больш таго, не выключэнне, што дэманалагічныя персанажы-дамавікі, вадзянікі, лешыя, лесавыя бабы і т.д., калісьці былі язычніцкімі багамі, такімі ж напрыклад, як Дажджбог, Пярун, Велес. Але ніхто не ведае, што за імі схавана. Язычніцтва - вялікі свет, яно існавала не адно тысячагоддзе. Магчыма ў нас, як і ў старажытных грэкаў ці рымлян, таксама былі свае багі - уладары стыхій, пачуццяў, з'яў і так далей, выказвае сваё меркаванне А. Ненадавец. А да нашых дзён дайшлі толькі асобныя водгласы тых раннеязычніцкіх вераванняў, прыняўшых форму розных прыкмет і забабонаў, якія да гэтага часу такія моцныя ў народзе.

Гэта самы старажытны і недаследаваны пласт беларускага фальклору. І з цягам часу, многае страчана беззваротна..."




Між тым па дэманалогіі можна сказаць, мы наперадзе ўсёй планеты. Навукай прызнана, што беларуская дэманалогія, - адна з самых "багатых" у свеце! Сярод славян нам дакладна няма роўных.




Па словах вучонага, у параўнанні з другімі краінамі, уседэманалагічныя персанажы беларускага фальклору добрыя. Яны не страцілі канчаткова чалавечых якасцяў, не страцілі аблічча чалавека. Беларускі чорт не быў крыважэрным, па-свойскі адносіўся да чалавека. З'яўляўся там і тады, калі чалавеку патрэбна было над кім пасмяяцца. Больш таго, чалавек заўсёды вельмі жорстка абыходзіўся з ім. Прасачыўшы за чортам па легендах і паданнях, якія запісаў А. Ненадавец, можна сказаць, беларускі чорт - самы памяркоўны чорт на свеце.

Яшчэ адзін вобраз, які сустракаецца ў легендах і паданнях - гэта русалка. У беларускай міфалогіі русалка, напэўна, самы любімы персанаж. Гэта амаль станоўчы вобраз, які дайшоў да нашых дзён і знаходзіцца на мяжы незямнога і зямнога свету.

Нашы людзі заўсёды адносіліся да русалак спагадліва. І на гэта ёсць свае прычыны. Па народным павер'ям імі станавіліся жанчыны і дзяўчаты, якія скончылі жыццё самагубствам або ўтапіліся ў час купання. У народзе лічылася, што пасля сваёй смерці яны ішлі ва ўслужку да вадзянога. На "русальскім тыдні" выходзілі з вадаёмаў, гулялі, вадзілі карагоды, гойдаліся на галінках дрэў, чакалі спазняючых падарожных у жыцце.



Тое ж самае адбывалася і на Купалле. У народзе лічылася, што русалка можа зазваць да сябе. Але на самой справе яны тапілі далёка не ўсіх. Датыкаючыся да чалавека, яны ж адразу даведваліся, якое жыццё было раней. Калі добрае -забіралі да сябе, калі дрэннае - выштурхоўвалі на паверхнасць. У сваіх кнігах А. Ненадавец да ўвагі чытачоў прапануе артыкулы, прысвечаныя пакланенню старажытных беларусаў дрэвам і камяням, вужам і гадзюкам, язычніцкім багам. А таксама апавядае пра жывых прадвеснікаў лёсу: пеўня, зязюлю, крумкача. Звяртае нашу ўвагу на вобразы ваўкалака і дамавіка, мядзведзя і пчалу, хаця ў цэлым выглядзе звесткі пра іх не існавалі. Болей таго, аб пакланенні беларусаў вужам і гадзюкам увогуле пісалася мала, ды і іншыя тэмы слаба асвятляліся ў нашай літаратуры. Усе навуковыя працы Аляксей Ненадавец падмацоўвае творамі з вуснай народнай творчасці.

Асабліва плённа працуе вядомы беларускі этнограф і фалькларыст у апошні час. Яго кола зацікаўленняў самае разнастайнае: ад карпатлівага збірання такога цікавага жанру, як праклён, да гістарычна-дакументальных даследаванняў. Найбольш значныя манаграфіі - "Міфалогія. Духоўныя вершы", "Ул. Караткевіч. Прырода, фальклор і творца".

Як бачым, геаграфічны абсяг творчых зацікаўленняў даследчыка даволі шырокі, але, як ён сам прызнаецца ў шматлікіх інтэрв'ю, адпачывае душою толькі на радзіме, на Палессі.










